Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

DOI:10.17951/sb.2024.18.95-119
Studia Białorutenistyczne 18/2024 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Zhanna Nekrashevich-Karotkaja

Adam Mickiewicz University in Poznan (Poland)
e-mail: zhanek@amu.edu.pl
https://orcid.org/0000-0001-9544-2159

Моўныя дыспазіцыі ў пісьменстве беларускай культурнай прасторы XVI – першай паловы XIX стагоддзя: рэвізія традыцыйнага метанаратыву беларусістыкі

Language Dispositions in Literary Works of the Belarusian Cultural Space of the 16th – First Half of the 19th Century: a Revision of the Traditional Metanarrative of the Belarusian Studies

Dyspozycje językowe w twórczości literackiej białoruskiej przestrzeni kulturowej XVI – pierwszej połowy XIX wieku: rewizja tradycyjnej metanarracji białorutenistyki

Abstract

The basis of the Belarusian historical metanarrative since the Soviet times has been the thesis of polonization as the cause of the gradual decline of the Belarusian language, which was revived in the 19th century. The ideologeme of unfavourable conditions for the development of the language of the Belarusian people, which was actively supported in the historical discourse of the BSSR, retains its relevance in the post-Soviet period. At the same time, the linguistic identification of literary is presented rather amorphously in scientific and didactic publications. Most often, the absence or blurriness of linguistic characteristics is connected with the researchers' desire to create idealized concepts of literary development, which in one way or another articulate the aspiration of literary writers belonging to the Belarusian cultural space to sacralize the (Old)Belarusian language and use it in their works. The purpose of this article is to reconstruct the actual linguistic disposition in the Belarusian cultural space of the 16th–19th centuries from the historical and literary perspective, having determined the place in this disposition of the Ruthenian language of the Grand Duchy of Lithuania (Old Belarusian language) as well as the mixed idiom recorded in the texts of the 16th – first half of the 19th century.

Keywords: literature of Belarusian cultural space, Ruthenian language of the Grand Duchy of Lithuania, mixed idiom, Polish language, desired translation

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Abstrakt

Od czasów sowieckich podstawą białoruskiej metanarracji patriotycznej była teza o polonizacji jako głównej przyczynie stopniowego upadku powstałego w XIX wieku języka białoruskiego. Propagowana w dyskursie historycznym i kulturowym BSRR teza o niekorzystnych dla rozwoju języka narodu białoruskiego warunkach nie straciła na aktualności w okresie postradzieckim. Interpretacje tekstów z tego okresu pod kątem językowym są wieloznaczne: brak lub niewyrazistość lingwistycznej analizy wiąże się z wykreowaniem wyidealizowanych koncepcji rozwoju literackiego, mających świadczyć o dążeniu pisarzy należących do białoruskiej przestrzeni kulturowej do sakralizacji (staro)białoruskiego języka i wykorzystania go w swojej twórczości. Celem artykułu jest rekonstrukcja osobliwości językowych w białoruskiej przestrzeni kulturowej XVI–XIX wieku z perspektywy historii literatury, a także określenie miejsca w tym kontekście roli języka ruskiego Wielkiego Księstwa Litewskiego (języka starobiałoruskiego) oraz mieszanego idiomu, odnotowanego w tekstach z XVIII – pierwszej połowy XIX wieku.

Słowa kluczowe: literatura białoruskiej przestrzeni kulturowej, język ruski Wielkiego Księstwa Litewskiego, idiom mieszany, język polski, wymagany przekład

Анатацыя

Грунтам беларускага метанаратыву з савецкіх часоў быў тэзіс пра паланізацыю як прычыну паступовага заняпаду беларускай мовы, якая адрадзілася ў XIX ст. Ідэалагема неспрыяльных умоў развіцця мовы беларускага народа, якая актыўна падтрымлівалася ў гісторыка-культурным дыскурсе БССР, захоўвае сваю актуальнасць і ў постсавецкі перыяд. Разам з тым, моўная ідэнтыфікацыя літаратурных твораў прадстаўлена ў навуковых і дыдактычных публікацыях даволі аморфна. Часцей за ўсё адсутнасць або невыразнасць лінгвістычных характарыстык звязана з жаданнем даследчыкаў ствараць ідэалізаваныя канцэпцыі літаратурнага развіцця, якія так ці інакш артыкулююць імкненне літаратараў, прыналежных да беларускай культурнай прасторы, сакралізаваць (стара) беларускую мову і выкарыстоўваць яе ў сваёй творчасці. Мэта артыкула – рэканструяваць рэальную моўную дыспазіцыю ў беларускай культурнай прасторы XVI–XIX стст. з гісторыка-літаратурнай перспектывы, вызначыўшы месца ў ёй рускай мовы Вялікага Княства Літоўскага (старабеларускай мовы), а таксама мяшанага ідыёму, які зафіксаваны ў тэкстах XVIII і пачатку XIX ст.

Ключавыя словы: літаратура беларускай культурнай прасторы, руская мова Вялікага Княства Літоўскага, мяшаны ідыём, польская мова, дэзідэратны пераклад

1. Уводзіны

Нацыянальную гісторыка-культурную легенду ствараюць з пэўнымі мэтамі выдатныя прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты, а яе змястоўнае напаўненне сведчыць пра прыярытэты духоўнага жыцця грамадства. Аляксандр Філюшкін прыйшоў

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

да высновы, што расійская гістарыяграфія прадстаўляла і прадстаўляе тыя землі, што сёння ўваходзяць у склад Расійскай Федэрацыі, як краіну, якую з часоў Сярэднявечча і да сённяшняга дня ўвесь час хтосьці альбо патаемна, альбо яўна хоча падняволіць: ад мангола-татараў і нямецкіх рыцараў да шматлікіх „тайных агентаў уплыву" і „пятых калонаў". На думку вучонага, гэтым перманентным перажываннем або самой іншаземнай агрэсіі, або яе чакання часта апраўдваецца даганяючы тып развіцця Расіі: маўляў, не было часу стварацца і дасканаліцца, трэба было выжываць і абараняцца (Filûškin, 2008, s. 95, 103).

Захапленне расійскіх гісторыкаў уяўленнямі пра „супастатаў", якія ўвесь час марылі запанаваць над Маскоўскай дзяржавай / Расіяй, Філюшкін назваў комплексам *translatio servilii* (перадача нявольніцтва; у перакладзе аўтара – „длящееся рабство"). Падобны комплекс з пачатку XX ст. акцэптавала і беларуская літаратурная гістарыяграфія, стварыўшы паралельна аптымістычнае ўяўленне пра „залаты век" беларускай культуры з наўмысна дэкларованай думкай пра росквіт (стара)беларускай мовы, які прыпаў на перыяд Рэнесансу. Працягам гэтага наратыву была тэза пра імперскіх (спачатку польскіх, потым расійскіх) бюракратаў, якія быццам бы перашкаджалі натуральнаму функцыянаванню гэтай мовы. Побач з уяўленнем пра „бюракратычныя перашкоды" і ў XXI стагоддзі пачэснае месца ў навукова-дыдактычных працах займае таксама канстатацыя „неспрыяльных умоваў для развіцця літаратуры" (Maldzis, 2010, s. 825, 854).

Пачуццём нацыянальнай траўмы прасякнута згадка той гістарычнай акалічнасці, пра якую сто гадоў таму пісаў Максім Гарэцкі ў сваім першым аглядзе па гісторыі беларускай літаратуры: у 1697 г. сейм Рэчы Паспалітай выдаў дэкрэт, згодна з якім старабеларуская / руская мова Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ)[1] была выцеснена польскай з судовай практыкі і дзяржаўнага справаводства (Garèckì, 1921, s. 45). Гэты нібыта важны для далейшага літаратурнага развіцця факт з падачы М. Грэцкага паўтараюць у шматлікіх падручніках па гісторыі беларускай літаратуры не толькі беларускія, але і замежныя аўтары, нават з цытаваннем адпаведнай пастановы ў польскім арыгінале: *Pisarz powinien po polsku, a nie po rusku pisać* (McMillin, 1977, s. 69).

Наколькі можа быць верыфікавана уяўленне пра штучныя перашкоды, створаныя кімсьці для развіцця (стара)беларускай мовы і, адпаведна, літаратурнай творчасці ў беларускай культурнай прасторы[2]? Як, у якой ступені і для стварэння якіх тэкстаў яна выкарыстоўвалася? Якімі былі яе ўзаемаадносіны з іншымі пісьмовымі мовамі Вялікага Княства Літоўскага – лацінскай, польскай, царкоўнаславянскай? У гэтым даследаванні, якое скіравана на неаднародныя ў моўных і графічных адносінах літаратурныя тэксты з беларускай культурнай

[1] Адпаведны глотанімічны дыскурс разглядаецца ў падраздзеле 1.1 гэтага артыкула.

[2] Больш падрабязна пра тэрмін „беларуская культурная прастора" і мэтазгоднасць яго ўжывання гл.: Nekrašèvič-Karotkaâ, 2020a, s. 8.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

прасторы ранняга Новага часу і іх моўную характарыстыку, разглядаецца пытанне эвалюцыі рускай мовы ВКЛ (гл.: Budz′ko, 2017, s. 66), яе ўдзел у моўным кантакце, а таксама аналізуецца тое сімвалічные значэнне, якое прыпісваліся ёй у гісторыка-літаратурным дыскурсе. У далейшым глатонім *руская мова* ўжываецца ў артыкуле для пісьмовай мовы ВКЛ (старабеларускай мовы), глатонім *расійская мова* – для дзяржаўнай мовы Расійскай імперыі і сучаснай расійскай мовы.

1.1. „Naša mowa čyściusieńkaja... zawiecca biełaruskaj”?

У кантэксце разваг беларускіх аўтараў пра даўняе пісьменства рускай мове адкрыта або латэнтна прыпісваецца дамінуючая роля. Адпаведны сімвалічны капітал стварыў яшчэ Францішак Багушэвіч у прадмове да зборніка *Dudka biełaruskaja* (Кракаў, 1891), апублікаванага пад псеўданімам Мацей Бурачок. Дыегетычны *мы*-наратар, разважаючы „ab našaj baćkawaj spradwiečnaj mowie, katoruju my sami, dyj nie adny my, a ŭsie ludzi ciomnyja mužyckaj zawuć, a zawiecca jana biełaruskaj”, успамінае бачаную калісьці вялікую колькасць „starych papierań, pa dwieście pa trysta hadoŭ tamu pisanych u našaj ziamli i pisanych wialikimi panami, a našaj mowaj čyściusinkaj jakby nawat ciapier pisałasia” (Buraczok, s. [III]). Такім чынам, паэт-народнік атаясаміў рускую мову ВКЛ і новую беларускую мову, якая ў часы Багушэвіча яшчэ не мела аднастайнай кадыфікацыі. Ці можна знайсці навуковае абгрунтаванне для такога атаясамлення?

У публікацыях беларускіх, а таксама часткі польскіх і нямецкіх вучоных згаданая Багушэвічам „мова старых папераў” называецца беларускай або старабеларускай (гл.: Bułyka i in., 1988; Barszczeŭkaja 2013; Kurzowa, 1993, s. 4; Bieder, 2017, s. 208; Rohdewald, 2007). Больш дэталёваму абмеркаванню гэтага тэрміна, а таксама тэрміналагічных альтэрнатыў *старабеларуская мова*, *prosta mowa*, *ruthenische Sprache*, *Mittelruthenisch*, *Ruthenian language* прысвечаны шматлікія навуковыя публікацыі не толькі беларускіх, але і замежных даследчыкаў (Moser, 2002; Moser, 2005). Аркадзь Жураўскі прапанаваў тэрмін *старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова* (Žuraŭskì, 1990, s. 507), які выразна пазначае сферу яе выкарыстання.

Руская мова ВКЛ не была навукова кадыфікаваная і актыўна ўдзельнічала ў моўным кантакце, таму на працягу ўсяго перыяду свайго функцыянавання ў канкрэтнай культурнай прасторы яна насычалася шматлікімі лексічнымі, граматычнымі і сінтаксічнымі рэгіяналізмамі. Разам з тым, ужо пасля свайго выхаду з пісьмовага ўжытку яна стала ключавым фактарам фарміравання беларускай гісторыка-культурнай свядомасці. Вячаслаў Чамярыцкі, згодна з традыцыяй Багушэвіча атаясаміўшы беларускую і рускую мовы, сфармуляваў адпаведны канцэптуальны тэзіс: „Белорусская литература XIV – начала XVII в. постепенно приобретает национальный облик, т. е. она становится белорусской

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

по содержанию, форме, языку" (Čemerickij, 1985, s. 500). На сённяшні дзень сам літаратурны канон дэканструюе гэту дэзідэратную[3] канстатацыю: зборы тэкстаў даўняй беларускай літаратуры прадстаўлены творамі на царкоўнаславянскай, рускай, лацінскай і польскай мовах (гл.: Bogdan і Čamârzkì, 2003; Twaranowicz і Sakowicz, 2004). Больш таго, тэксты на іншых мовах нават дамінавалі ў мастацкай і публіцыстычнай літаратуры ў параўнанні са створанымі на рускай або новай беларускай мове практычна да канца XIX ст. Тым не менш, псеўдапатрыятычныя фармулёўкі да сённяшняга дня адыгрываюць важную ролю не толькі ў акадэмічным, але і ў дыдактычным дыскурсе, як у Беларусі, так і за яе межамі. У нядаўна апублікаваным артыкуле Арнольд Макмілін атаясамлівае сучасную беларускую мову з рускай, калі ад развагаў, што пачаткі беларускай мовы сягаюць у Сярэднявечча, пераходзіць непасрэдна да беларускамоўнай творчасці аўтараў XIX ст. На думку брытанскага вучонага, апошнія вярнулі беларускую мову да жыцця, „although, of course [sic! – Ж.Н.-К.], its use was forbidden by the Tsarist government during the entire length of this period, the ban being lifted only in 1905" (McMillin, 2023, s. 63).

1.2. Канцэпцыя полілінгвальнасці даўняй літаратуры ва ўмовах перабольшання нацыянальнага наратыву

Вывучаючы эвалюцыю беларускай літаратурнай гістарыяграфіі, Марыён Рутц выявіла шматлікія прыклады перабольшання нацыянальнага наратыву, а таксама скажэнні і фальсіфікацыі, што паўстаюць на гэтым грунце. Адно з найважнейшых – неадэкватная ацэнка (стара)беларускай мовы (Rutz, 2021, s. 120). Па сутнасці, беларуская акадэмічная супольнасць толькі ў XXI ст. акцэптавала навуковае ўяўленне пра полілінгвальнасць сярэднявечнай і раннемадэрнай літаратуры Беларусі. Немалую ролю ў гэтым адыгралі публікацыі Сяргея Кавалёва (гл.: Kavalëŭ, 2010; Kavalëŭ, 2011, s. 8). Аднак нават пры агульным прызнанні тэзы аб шматмоўнасці гісторыкі літаратуры рэдка абмяркоўваюць функцыянальны аспект выкарыстання розных моў. Тым часам мовазнаўцы канстатуюць „пісьмовае чатырохмоўе з размежаваннем у сферы функцыянавання" (Bulyka і in., 1988, s. 4), якое склалася на Беларусі ў часы ВКЛ.

У працах гісторыкаў літаратуры можна напаткаць у лепшым выпадку спарадычныя заўвагі адносна мовы літаратурнага помніка; найчасцей моўная характарыстыка таго ці іншага тэксту наогул адсутнічае (Rutz, 2021, s. 130, 144). І калі ў галіне медыевальнага літаратуразнаўства уяўленне пра полілінгвальнасць пісьменства дазволіла ўключыць у канон нават тых аўтараў, якія пісалі выключна па-лацінску або выключна па-польску, то спецыялісты ў галіне даследавання

[3] Дэзідэратны – ад лац. *desideratus* – „пажаданы".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

літаратуры XIX ст. абапіраліся і ў большасці сваёй усё яшчэ абапіраюцца на іншыя падыходы.

1.3. Беларусацэнтрычнасць як грунт ідэнтыфікацыйных і графічных маніпуляцый у даследаваннях літаратуры XIX стагоддзя

У раздзеле *Літаратура XIX стагоддзя* другога тома акадэмічнай гісторыі беларускай літаратуры (Мінск 2007) манаграфічныя артыкулы прысвечаны творчасці толькі тых аўтараў, якія пісалі на беларускай мове, нават калі гэта была вельмі абмежаваная колькасць тэкстаў. Пры гэтым слаба аргументаванага дапушчэння даследчыка (у суправаджэнні выразаў кшталту „відаць", „хутчэй за ўсё", "варта пагадзіцца, што") адносна аўтарства такога тэксту было дастаткова для выключэння твора з катэгорыі *dubia* і ўключэння яго ў беларускі літаратурны канон. Эстэтычныя вартасці твора таксама не мелі значэння, важнай была мова напісання, якая безагаворачна класіфікавалася як беларуская. Так, Уладзімір Мархель прызнаў Уладзіслава Сыракомлю аўтарам двух вершаў на беларускай мове (Marhel′, 2007b, s. 269–273). Аднак Юзаф Трыпуцька яшчэ ў 1955 г. аргументавана выказаўся супраць такой магчымасці, зрабіўшы наступную выснову: „W świetle dość ostrożnych wypowiedzi poety na temat jego praktycznych znajomości białoruszczyzny, jakie wyżej przytoczyłem, nie wydaje mi się, by sprawa autorstwa miała być przesądzona ostatecnie" (Trypućko, 1955, s. 244–245).

У 2019 г. Антоні Францішак Брыль неаспрэчна даказаў, што Сыракомля не з'яўляецца аўтарам аднаго з тых вершаў, якія прынамсі паўстагоддзя прыпісваюцца ягонаму аўтарству (Bryl, 2019, s. 7). Паказальна, што ў кнізе Ю. Трыпуцькі названы верш згадваецца пад назвай *Użo ptaszki piajuć usiudy...*, а ў беларускамоўных зборах тэкстаў, падручніках і даследчыцкіх працах – як *Ужо птушкі пяюць усюды*... Гэты прыклад наглядна сведчыць, што перапісванне назвы кірыліцай у беларускамоўных публікацыях адначасова спрычынялася да моўнай мадэрнізацыі тэксту, а значыць, зніжала ступень яго аўтэнтычнасці. Нягледзячы на гэта, замена лацінкі кірыліцай пры адначасовай арфаграфічнай мадэрнізацыі ў перавыданнях тэкстаў практыкавалася на працягу ўсяго савецкага перыяду. Графічная неадэкватнасць новых перавыданняў даўніх тэкстаў часцей за ўсё захоўваецца таксама ў беларускамоўных выданнях і публікацыях XXI ст.

Уяўленне пра польска-беларускае двухмоўе ў даследаваннях па літаратуры XIX ст. фарміравалася праз прызму беларусацэнтрычнай ідэі народнасці літаратуры. Віктар Каваленка даводзіў: „Беларуская мова ў творчасці беларуска-польскіх пісьменнікаў была выяўленнем перш за ўсё народнасці і з'яўлялася ў той час паказчыкам ідэйна-мастацкай накіраванасці, ледзь не жанравай прыкметай" (Kavalenka, 1977, s. 78). Нягледзячы на відавочнае выпукліванне ідэалагемы народнасці, тэза В. Каваленкі канстатуе наяўнасць у беларускім

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

пісьменстве XIX ст. адмысловай плыні (даследчык кваліфікуе яе як асобны жанр), якая вызначалася моўнай спецыфікай. Гаворка ідзе пра тыя тэксты, якія былі арыентаваны на рэцыпіентаў з ніжэйшых сацыяльных слаёў.

У даследаваннях постсавецкага часу пытанне пра мову літаратурнай творчасці таксама практычна не разглядалася ў функцыянальным аспекце. Адам Мальдзіс (2006: 825), характарызуючы літаратуру пераходнага перыяду (канца XVIII ст.), абмяжоўваецца канстатацыяй, што мясцовыя літаратары карысталіся ў сваіх творах польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай, пазней расійскай мовамі. Гэта агульная тэза нідзе далей не канкрэтызуецца у прыкладах, не вядзецца таксама гаворка пра ўзаемадзеянне гэтых моў.

Побач з разважаннямі пра фактары, якія нібыта перашкаджалі творчасці на беларускай мове, у гісторыка-літаратурных даследаваннях прысутнічаюць таксама аптымістычныя сцверджанні пра намеры і нават прагу польскамоўных аўтараў XIX ст. з Беларусі адрадзіць беларускую мову і пісаць на ёй. Акрамя таго, у беларускім і польскім акадэмічным і дыдактычным дыскурсе распаўсюджаны дэзідэратны (па сутнасці, сфальсіфікаваны) пераклад на беларускую мову фрагмента з парыжскай лекцыі Міцкевіча, у якім ён нібыта разважае пра беларускую мову (Cvìrka, 2000, s.181–182; Wasiluk, 2012, s. 52). У рэальнасці гэты фрагмент уяўляе сабой апісанне моўнай сітуацыі ва ўсходнеславянскім рэгіёне ў часы Пятра I, і словам „мова" (*langue*) Міцкевіч называе нішто іншае, як усю сукупнасць усходнеславянскіх моў і дыялектаў той эпохі. Для Міцкевіча ўсё гэта – маскавіта-руская мова, якая падзяляецца на тры дыялекты: *"La langue moscowito-russe se divise en trois dialectes"* (Mickiewicz, 1860, s. 428). Адзін з іх – „дыялект Белай Русі, які называюць рускім або літоўска-рускім" (*Le dialecte de la Russie blanche, que l'on appelle russien ou lithuano-russien*; Mickiewicz, 1860, s. 428). Аднак ні ў гэтым, ні ў іншых тэкстах Міцкевіч не ўжываў выразу „беларуская мова".

Як даследчыцкія працы, так і публікацыі перакладаў тэкстаў на беларускую мову ствараюць складаны дыскурс сфальсіфікаванай моўнай ідэнтычнасці ў даўнім пісьменстве. У нашых папярэдніх публікацыях не толькі выяўляліся гэтыя фальсіфікацыі, але і выказвалася прапанова перайсці ад аморфных тэзісаў пра „народнасць" і „фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці" да паняццяў культурнай памяці і культурнай прасторы (Nekrašèvìč-Karotkaâ, 2017; Nekrašèvìč-Karotkaâ, 2020a, s. 150–160, Nekrašèvìč-Karotkaâ, 2020b, s. 44–45). Уяўленне пра Беларусь як культурную прастору са сваімі адметнымі месцамі памяці (гл.: Nora, 1999, s. 26–27) дазваляе растлумачыць моўныя стратэгіі аўтараў, якія паходзілі з гістарычнай Беларусі або гістарычнай Літвы – тых іх частак, якія складаюць тэрыторыю сённяшняй Рэспублікі Беларусь.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

2. Моўны кантакт ці моўная агрэсія?

Пішучы пра літаратуру позняга Барока, А. Мальдзіс разважае пра вельмі неспрыяльныя ўмовы для развіцця ўласна беларускай (г. зн. беларускамоўнай) літаратуры (Maldzis, 2010, s. 825–826). Падобны наратыў можна сустрэць і ў польскамоўных даследаваннях: пра тыя ж неспрыяльныя ўмовы для развіцця друкаванай прадукцыі на беларускай мове ў XIX ст. разважае Ёанна Васілюк (Wasiluk, 2012, s. 57). Такім чынам, натуральная сітуацыя моўнага кантакту падаецца ў ракурсе гісторыі беларускай літаратуры як вынік сацыяльнага і культурнага ўціску.

Няма ніякіх гістарычных сведчанняў, што выкарыстанне беларускай мовы ў сферы прыгожага (а не дзелавога) пісьменства калі-небудзь забаранялася. Цікава, што працытаваная на пачатку артыкула пастанова сейма 1697 г. не была сэнсавызначальнай для самога М. Гарэцкага. Адзначыўшы заняпад рускай мовы ў галіне афіцыйнага справаводства, даследчык заўважыў: „У іншым ужытку наша старадаўняя кніжная мова існавала і далей, аж да канца 18 веку" (Garèckì, 1921, s. 45). „У іншым ужытку" азначала, у прыватнасці, сферу вытанчанай славеснасці, дзе ніхто і ніколі не забараняў выкарыстоўваць рускую мову. У фармулёўках М. Гарэцкага можна, дарэчы, убачыць сведчанне моўнага кантакту: на думку даследчыка, творы да XIII ст. напісаны на „старабеларускай мове, перасыпанай царкоўнаславянізмамі" (Garèckì, 1921, s. 4); помнікі часоў Рэнесансу таксама напісаны на старабеларускай, але цяпер ужо „перасыпанай паланізмамі" (Garèckì, 1921, s. 18).

Тым часам нішто не пацвярджае факту супрацьдзеяння рускай або беларускай мове нават пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Аляксандр Шлюбскі прыйшоў да высновы, што забароны і абмежаванні на друкаваную прадукцыю ў Расійскай імперыі былі накіраваны не супраць беларускай, а супраць польскай мовы. Яны датычылі толькі выкарыстання лацінскага альфабэту, сама ж беларуская мова выкарыстоўвалася расійскім урадам для ажыццяўлення паспяховай русіфікацыі і вялікадзяржаўнай палітыкі (Šlûbskì, 1928, s. 330–333). Герман Бідэр, цытуючы публікацыю Антона Луцкевіча, пагаджаецца з ім, што адмысловых дэкрэтаў або распараджэнняў аб пераследах беларускай мовы не было проста ў сувязі з тым, што расійскія чыноўнікі лічылі беларушчыну дыялектам рускай мовы (Bieder, 2017, s. 221).

Абумоўленае патрабаваннямі савецкай ідэалогіі ўяўленне пра моўную агрэсію з боку польскай мовы на землях старажытнай Беларусі было створана штучна. Насамрэч падобныя развагі пра барацьбу моў з магчымасцю перамогі адной і паразы другой упісваюцца ў той легендарны фармат *translatio servilii*, пра які разважаў А. Філюшкін. У рэальнасці можна і трэба гаварыць пра натуральную сітуацыю моўнага кантакту, якая была дастаткова складанай і рэальна рэлевантнай развіццю ўласна мастацкай літаратурнай традыцыі,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

прычым не толькі на землях Беларусі, але ў цэлым усходнеславянскім рэгіёне. У тэкстах розных жанраў фіксаваліся мяшаныя формы выкарыстання мовы.

Арнольд Макмілін заўважыў такое змяшэнне ў надзвычай папулярных у эпоху Барока вершах і кантах (McMillin, 1970, p. 1). Гетэрагеннасць мовы гэтых тэкстаў была звязана з адмысловым культурным (адукацыйным) капіталам іх аўтараў:

> Most [authors] were graduates of the Kiev Religious Academy, and many had spent some years in Poland completing their education at Catholic colleges. Inevitably the Russian Church Slavonic which they set out to write was contaminated by Polonisms, Belorussianisms, and Ukrainianisms (McMillin, 1970, p. 1).

Згаданая брытанскім вучоным моўная кантамінацыя – фундаментальная праблема беларускай гістарычнай філалогіі. Нават у выданнях Францыска Скарыны, аб'яднаных назвай *Бивлия руска*, нялёгка правесці адрозненне паміж царкоўнаславянскімі і ўласна беларускімі элементамі (Bulyka i in., 1988, s. 5–6). У XVII і XVIII ст. іх змяшэнне яшчэ больш узмацняецца: руская і царкоўнаславянская як мовы кніжнай культуры перамешваюцца не толькі з літаратурнай польскай мовай, але ў гэтую моўную сумесь пранікаюць таксама элементы вернакулярнай мовы беларусаў.

Сайман Льюіс адзначаў, што беларуская культура цікавая прынамсі ў сувязі з наяўнасцю змяшаных формаў выкарыстання мовы (Lewis, 2019b, p. 162). У першую чаргу такія формы зафіксаваны ў літаратурных творах. Камунікацыйная прастора ВКЛ была надзвычай разнастайнай, аднак спецыфіка моўнай сітуацыі тут не была ў той гістарычны перыяд асэнсавана самімі жыхарамі дзяржавы (Niendorf, 2006, s. 97; Rohdewald, 2007). Іншымі словамі, ніхто з тагачасных аўтараў ні на адной мове не выказваўся наконт агрэсіі адной мовы ў адносінах да іншых. Больш таго, распаўсюд „паланізацыі", пра які ахвотна разважаюць беларускія гуманітарыі, канстатаваць праблематычна, паколькі насамрэч аж да XVII ст. назіралася фактычная „русінізацыя" польскай мовы. Руская мова зрабілася ў ВКЛ *lingua franca* вусных зносін нават для татар і яўрэяў (Niendorf, 2006, s. 109, 118). Да аналагічнай высновы нашмат раней прыйшла Ніна Мячкоўская (Mečkovskaâ, 1984, s. 11).

Аднак у сферы прыгожага пісьменства функцыі рускай мовы былі абмежаванымі. Уладзімір Кароткі аргументавана засведчыў, што гэта не была мова твораў вядучых літаратурных жанраў (Karotki, 1991, s. 14). Яна выкарыстоўвалася пераважна ў справаводстве (да 1697 г.), функцыянавала як мова рукапісных хронік ВКЛ, эмблематычных вершаў і рэлігійнай паэзіі (гл.: Slìž, 2013; Nekrašèvìč-Karotkaâ, 2020, s. 153–154). Цікава, што ў найбольш перспектыўнай галіне літаратурнай творчасці – *fiction* – руская мова абслугоўвала выключна сферу перакладаў папулярных гісторый пра Трыстана і Ізольду, Аляксандра Вялікага або каралевіча Баву. Арыгінальная белетрыстыка на гэтай мове не стваралася.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Польская мова, паступова заваёўваючы вядучае месца ў пісьменстве, пануючы ў адукацыйным дыскурсе Рэчы Паспалітай, натуральным шляхам здабывала сабе жыццёвую прастору (гл.: Kurzowa 1993, s. 19–24). Ужо на пачатку XVII ст. шляхта ВКЛ лічыла яе больш звыклай (*przyzwoitrzym językiem*, гл.: Karotki, 2013, s. 17). Пры гэтым шматмоўная сітуацыя ніколі не пераўтваралася ў моналінгвальную: „[...] do końca I Rzeczpospolitej cechuje ją jako organizm państwowy wielojęzyczność mieszkańców, która do końca XVIII wieku była czymś oczywistym, gdyż za istotną uważano lojalność obywateli wobec państwa, a nie język, jakim się posługują" (Bobrownicka, 2003, s. 119).

Важным чыннікам умацавання мовы была магчымасць друкаваць кнігі на гэтай мове. Апублікаванне гістарыяграфічнага сачынення Мацея Стрыйкоўскага *Kronika Polska, Litewska i wszystkiej Rusi* (Królewiec, 1582) спрычынілася да паступовай маргіналізацыі і заняпаду традыцыі агульнадзяржаўнага летапісання на рускай мове. Больш таго, выданне любой кнігі на старабеларускай мове было складанай і фінансава стратнай для выдаўца справай. Адпаведнае сведчанне пакінуў Касьян Саковіч у прадмове да выдадзенага ім перакладу кнігі іспанскага пісьменніка Мігеля Камалады:

> Wprawdzie przetłumaczyłem ia był tę książkę na prosty nasz ruski język / chcąc ią dla narodu naszego w druk podać / lecz <...> że u nas z wielkim nakładem y kosztem dla drogości samego papieru przychodzi księgi z druku wydawać / za czym y księgi droższe niżeli Polskie: do tego woli sobie każdy y Polską księgę kupić / bo y tańsza y ku wyrozumieniu łatwieysza niż Słowieńska ([Comalada, Miguel], 1625, f. ☩☩ verso, paginatio II).

Са зместу гэтага выказвання вынікае, па-першае, што кніга на польскай мове карысталася большым попытам у беларусаў і ўкраінцаў. Па-другое, нават самі выдаўцы не мелі пэўнасці ў выкарыстанні глатонімаў: кніга на рускай мове для Саковіча – тое самае, што *księga Słowieńska*, г. зн. кніга на царкоўнаславянскай мове. Дыстрыбутыўную ролю тут адыгрывала графіка: выразна адрозніваліся паміж сабою кнігі кірылічнага і лацінскага шрыфту, тым часам ідэнтыфікаваць мову ў выпадку ўжывання кірыліцы было не так лёгка.

У лінгвістычных даследаваннях адсутнічаюць агульнапрынятыя крытэрыі ідэнтыфікацыі тэксту на рускай мове. Нягледзячы на яе наддыялектны характар, яна была вельмі неаднародная, што ўскладняе задачу яе апісання і кадыфікацыі. *Grammatica sclavonica* Івана Ужэвіча (парыжскі рукапіс 1643 і араскі рукапіс 1645 г.) не вырашыла гэтай задачы, паколькі многае з таго, што Ужэвіч піша пра рускую мову, можна прымяніць і да апісання царкоўнаславянскай; да таго ж вербальны матэрыял граматыкі выяўляе блізкасць да польскай мовы на ўзроўні лексікі (Bunčić, 2006, s. 357–358). Такое становішча цалкам вытлумачальнае: руская мова найчасцей функцыянавала ў сітуацыі гетэрагеннага моўнага кантакту і ўдзельнічала ў стварэнні гібрыдных моўных дыскурсаў. Адным з такіх

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

гібрыдных у моўных адносінах тэкстаў, уключаных у канон даўняй беларускай літаратуры, з'яўляюцца мемуары навагрудскага падсудка Фёдара Еўлашоўскага (1546–1616). Князь Тадэвуш Любамірскі, які ажыццявіў перавыданне помніка, адзначаў ва ўступе: „Rękopism Jewłaszewskiego <...> pisany w języku zachodnio-ruskim, z mocną nasiękłością języka polskiego" (Lubomirski, 1860, s. VIII). Асобныя фразы на рускай мове (на якой маглі камунікаваць паміж сабой жыхары Маскоўскага і Літоўскага княстваў) сустракаюцца і ў польскамоўнай паэме *Poselstwo i krótkie spisanie rozprawy z Moskwą* (1600–1601) Гальяша Пельгрымоўскага (гл.: Pielgrzymowski, 2010). Даволі доўга выкарыстоўвалася руская мова ў літургічным дыскурсе грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы, аж да яе афіцыйнай забароны ў Расійскай імперыі ў 1839 годзе.

У рэлігійнай і свецкай літаратуры руская мова актыўна змешвалася з іншымі мовамі ўжо ў XVI ст., насычалася дыялектнымі элементамі і рабілася падставай разнастайных макаранічных утварэнняў. Двухмоўе або шматмоўе ўнутры аднаго тэксту сустракаецца ў літаратуры ВКЛ пачынаючы з ранняга Барока, і ў падобных полілінгвальных дыскурсах маглі ўдзельнічаць усе чатыры пісьмовыя мовы ВКЛ. Тэкст мог ствараць дзвюма мовамі адначасова: напрыклад, паэма *Philopatris ad senatum populumque Lituanum* / *Miłośnik Oyczyzny do Senatu y Rzeczypospolitey Litewskiey* (1597) напісана спачатку па-лацінску, потым па-польску. Аднак магчыма было таксама змяшэнне дзвюх або больш моў у адным тэксце і нават у адным сказе. Найбольшую колькасць прыкладаў разнастайнага змяшэння моў прэзентуе палемічная літаратура (Karotki, 2013, s. 166–168). Руская мова выступала, як правіла, у білінгвальным дыскурсе разам з польскай. Так, напрыклад, *Harmonia albo konkordacja wiary* (1608) Іпацій Пацея была апублікавана паралельна на рускай і польскай мовах. Адначасовая прысутнасць розных моў у тэкстах, а таксама паралельнае функцыянаванне тэкстаў на розных мовах мела асаблівае значэнне ў кніжнай культуры ВКЛ, паколькі маркіравала розных адрасатаў літаратурнага наратыву з адрозным культурным капіталам (гл.: Rutz, 2022).

Наратар у прадмове да зборніка *Dudka biełaruskaja* абвяшчаў цёмнымі тых людзей, якія называюць беларускую мову мужыцкай, і яўна імкнуўся выклікаць негатыўнае стаўленне да такога эпітэту. Насамрэч ідэнтыфікацыя вернакулярнай мяшанай мовы як мужыцкай рэальна прадстаўлена ў гістарычным дыскурсе, але яна не несла ў сабе пеяратыўнай ацэнкі. Наадварот, прадстаўнікі беларускай шляхты і нават магнатэрыі ўжывалі гэтую мову ў тостах або панегірыках пад час святочных прамоў. Іншая справа, што ў сітуацыі адсутнасці кадыфікацыі як для рускай, так і для беларускай мовы надзвычай цяжка кваліфікаваць пэўныя моўныя элементы ў іх прыналежнасці да адной або другой мовы. Менавіта на гэтай падставе ўзнікалі дэзідэратныя інтэрпрэтацыі літаратуразнаўцаў, якія называлі гэтую мову беларускай без аніякай аргументацыі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

А. Мальдзіс прыгадвае ўспаміны Яўстахія Тышкевіча *Nasze strony* (Кракаў, 1871), у якіх апісваецца прыбыццё караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага да Радзівілаў у Нясвіж, дзе кароль палічыў дарэчным прамовіць тост не па-польску (Maldzis, 2001, s. 130). У скарочанай цытаце А. Мальдзіс замяняе лацінку арыгінала на кірыліцу, абвяшчае мову тоста беларускай і нічога не піша, як яна кваліфікавалася ва ўспамінах Тышкевіча. У арыгінале ж згаданы фрагмент выглядаў так: „Pamiętam jak w Albie w zwierzyńcu pod Nieświeżem, król rzekł do Radziwiłła *po chłopsku*: „Panie hospodaru, każ wina daty / Sztob w twojej chacie licha nie znaty" (Tyszkiewicz, 1871, s. 15).

Прэзентаванае тут маўленне *po chłopsku* праз „оканне" і наяўнасць архаічных форм інфінітыву на *-ty* лягчэй атаясаміць з рускай мовай. Аднак у іншых прыкладах прадстаўлена нашмат больш складаная сітуацыя моўнага кантакту.

Уключэнне ў польскамоўны тэкст слоў або фраз на рускай або вернакулярнай беларускай мове нярэдка служыла сродкам стварэння гумару і сатыры. Напрыклад, у сярэдзіне XVIII ст. францішканец Караль Жэра, шляхціч з Падляшша, склаў зборнік анекдотаў і гумарэсак *Vorago rerum. Torba śmiechu. Groch z kapustą. A każdy pies z innej wsi...*. У тэкстах Жэры польская мова часта суседнічае з фрагментамі мяшанай мовы жыхароў Падляшша. Вось адзін з такіх прыкладаў:

> Pop namówił sobie na roczną służbę parobka i ugodziwszy się z nim o zapłatę, taką z nim uczynił umowę, że: – Ja szto tobie skażu, to ty wsio powinien zdziełać, i choćby ja tobie szto co i prykroho zdziełał, to ty nie powinien się za teje hniewać na mienie (Żera, 1980, s. 198).

Для характарыстыкі стылю аўтара Казімера Жукоўска карыстаецца выражэннем „*kolokwialna swoboda języka*", „*rozigranie języka*", „*karuzel słowny"* (Żukowska, 1980; s. 12, 20). Прыёмы моўнай гульні і змяшэння моў сапраўды былі надзвычай характэрныя для гумарыстычнай літаратуры розных эпох, якая была арыентавана на сюжэт і персанажаў „з народа". Тым часам А. Мальдзіс і У. Мархель згадваюць зборнік Караля Жэры як унікальны тэкст, які прэзентуе беларускамоўную (!) прозу. У больш шырокім жа кантэксце артыкула ідзе гаворка пра крызіс беларускамоўнага пісьменства, асноўныя прычыны якога, на думку аўтараў, – „узмоцненая паланізацыя мясцовага насельніцтва і пашырэнне нарматыўнай эстэтыкі класіцызму, якая дапускала беларускае „прастамоўе" толькі ў „нізкіх", камічных і парадыйна-бурлескных жанрах" (Maldzis i Marhel′, 2007, s. 16). Такая фармулёўка мела сфарміраваць перакананне ў чытача, што чужая (польская) культура і варожыя эстэтычныя тэндэнцыі быццам бы „перашкаджалі" паўнавартаснаму развіццю беларускай нацыянальнай культуры ў XVIII ст.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

3. Руская мова ВКЛ як месца памяці, мяшаны ідыём і польская мова

Нягледзячы на маргінальнае становішча рускамоўных тэкстаў у літаратурным кантэксце ВКЛ, руская мова зрабілася рэлевантным месцам памяці ўжо ў творчасці філаматаў. У цытаванай вышэй лекцыі, прачытанай у *Collège de France,* Адам Міцкевіч паведамляў, што дыялектам Белай Русі карысталіся вялікія князі літоўскія ў іх дыпламатычнай карэспандэнцыі (*les grands-ducs de Lithuanie s'en servaient dans leurs dépêches diplomatiques*) (Mickiewicz, 1860, s. 428). Ян Чачот у прадмове да шостага тома *Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny* (1846) падрыхтаванай ім выдавецкай серыі, разважаючы пра неабходнасць навуковага апісання славяна-крывіцкай мовы (так называў Чачот мову сабраных ім песенных тэкстаў), даводзіў:

> Dostateczne zastanowienie się nad tą mową, którą w pamięci naszej żyjący jeszcze staruszkowie panowie między sobą mówić lubili, którą dotąd mówią panowie i ekonomowie z włościanami, w której pisano niegdyś u nas akta urzędowe, pozostaje w całości jakiemuś zdolnemu może włościaninowi, co się przez naukę wzniesie do głębszego rostrząsnienia doskonale znanego sobie języka (Czeczot, 1846, s. V).

Відавочна, што і Чачот, і Міцкевіч атаясамлівалі народныя беларускія гаворкі з рускай мовай або прынамсі лічылі іх вельмі блізкімі.

Адмысловую ролю ў стабілізацыі канцэпту „старабеларускай мовы" як месца памяці побач з цытаванай на пачатку артыкула прадмовай да зборніка Францішка Багушэвіча адыграў верш Яна Казіміра Пашкевіча *Полска квитне[т] лациною, Литва квитне[т] русчизною.* Шматлікія артыкулы беларускіх даследчыкаў даводзяць, што ён захаваўся ў адзіным экземпляры, быў запісаны на адвароце старонкі Статута ВКЛ 1529 г., прычым з пазначэннем даты (22 жніўня 1621 г.) і імя аўтара, што выглядае нетыповай з'явай у гісторыі літаратуры. Верш кананізаваны ў беларускім літаратуразнаўстве як узор грамадзянска-патрыятычнай паэзіі і гімн беларускай мове (агляд публікацый, прысвечаных гэтаму вершу, гл.: Nekrašèvìč-Karotkaâ, 2020, s. 52–53). Аднак даследаванне Ірыны Багдановіч пахіснула падваліны гэтай патрыятычнай канцэпцыі. Аўтарка скрупулёзна прааналізавала тыя акалічнасці, якія робяць верш дзіўным і анахранічным артэфактам у літаратурным кантэксце свайго часу. На яе думку, верш быў створаны ў сярэдзіне XIX ст. як удалая літаратурная містыфікацыя віленскім генерал-губернатарам і аматарам старажытнасцяў Аляксеем Сямёнавым (1799–1864) з мэтай умацавання ідэалогіі панрусізму, а таксама пашырэння русіфікацыйных культурных праектаў для легітымацыі панавання Расійскай імперыі на акупаваных літоўска-беларускіх землях пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (Bagdanovìč, 2020).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Адным з апошніх паэтычных тэкстаў на рускай мове ў гісторыка-літаратурным дыскурсе Беларусі лічыцца верш, аўтарства якога прыпісваецца Іаахіму Літавору Храптовічу (1729–1812). Рукапісны тэкст верша выявіў Адам Мальдзіс у Бібліятэцы Польскай Акадэміі навук у Курніку і апублікаваў яго ў часопісе *Pamiętnik Biblioteki Kórnickiej*, адзначыўшы, што гэта „wiersz białoruski, pisany alfabetem łacińskim" (Maldzis, 1978, s. 177). Ужо першая страфа дазваляе ідэнтыфікаваць тэкст як тыповую грануляцыю: „Wsem mnohi wiek w nowoy chaty / Pry hoynoy neba zapłaty / Żowite (sic!) bez wsakoi tuhy / Y iak Pany takoż y słuhy / Pry nowoy hodynie" (Maldzis, 1978, s. 177).

А. Мальдзіс вызначыў аўтарства верша, супаставіўшы згаданыя ў ім імёны бабулі і дзядулі з дадзенымі пра сям'ю Храптовічаў. Пры гэтым вучоны дапусціў, што аўтарам мог быць не толькі Іаахім Храптовіч, але таксама Адам Хмялеўскі, настаўнік са Шчорсаў, рэзідэнцыі Храптовічаў. У канцы артыкула аўтар заўважыў: „Odkrycie kórnickie znacznie wzbogaci historię literatury białoruskiej XVIII wieku" (Maldzis, 1978, s. 180). Сапраўды, гэты верш увайшоў ва ўсе зборы тэкстаў даўняй беларускай літаратуры (гл.: Bogdan і Čamârycki, 2003, s. 123–124). Аднак у пазнейшых перавыданнях тэкст заўсёды публікаваўся кірылічным шрыфтам, у якасці ж аўтара ўказваўся Іаахім Храптовіч, без аніводнай згадкі пра Адама Хмялеўскага, а таксама пра сястру Іаахіма Ганну Храптовіч, імя якой нават прысутнічае ў вершы. Гэты прыклад ярка ілюструе рэалізацыю дэзідэратнага імкнення даследчыка сфарміраваць у чытача думку, што Іаахім Храптовіч, рафінаваны арыстакрат і паліглот XVIII ст., выкарыстоўваў у сваёй паэтычнай творчасці рускую мову побач з многімі іншымі.

У рэальнасці ж тэксты XVIII–XIX стст. з беларускай культурнай прасторы сведчаць, што перад падзеламі Рэчы Паспалітай тут пашырыўся і актыўна функцыянаваў мяшаны ідыём. Гэты тэрмін выкарыстоўваецца ў сучасным мовазнаўстве для натуральна-моўнай знакавай сістэмы і ў першую чаргу ў спрэчных выпадках, калі дыскусійным з'яўляецца пытанне, пра што ідзе гаворка: пра мову ці пра дыялект? (Vinogradov, 1990, s. 171). Паняццем „белорусско-русский смешанный идиом" побач з тэрмінам „белорусско-русская смешанная речь" карыстаецца Герд Генчаль для пазначэння сітуацыі моўнага кантакту ў Беларусі ў XX ст. і XXI ст. (гл.: Hentšel′, 2013, s. 54; Hentšel′, 2017, s. 210), аднак у нямецкага мовазнаўцы складнік „рускі" пазначае, канечне, сучасную расійскую мову. Што праўда, адзначаная даследчыкам агульная характарыстыка сучаснай беларуска-расійскай мяшанай мовы адпавядае таксама спецыфіцы таго мяшанага ідыёму, пра які пісалі Чачот і Міцкевіч: „Речь, частично основанная на смешанном идиоме, имеет тенденцию сохранять заметную вариативность все то время, пока два (или больше) исходных идиома продолжают использоваться в данном социальном контексте" (Hentšel′, 2013, s. 55). У выпадку руска-беларускага мяшанага ідыёму, які функцыянаваў у беларускай культурнай прасторы XVII – XIX стст., ідзе гаворка пра спантаннае змяшэнне пісьмовай

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

рускай мовы ВКЛ, царкоўнаславянскай мовы і разнастайных усходнеславянскіх моўных элементаў[4].

Мяшаны ідыём функцыянаваў у тэкстах побач з польскай мовай. У прыватнасці, яго выкарыстоўваў Ян Чачот у сваіх гратуляцыйных вершах. Прычынай пераключэння кодаў (*code switching*), паводле Петэра Аўэра (Auer, 1999, s. 310) у тэкстах Чачота з'яўляецца або арыентацыя на гумар як асноўны стылістычны сродак (*Wiersz białoruski na przyjazd Adama* [Mickiewicza] (24.12.1819) (Czubek, 1922, s. 201), або неабходнасць стылізаваць мову персанажаў „з народу" (*Ciwun* (*Czuli my heto, szto jeść waszeć Ukrainiec*...), *Chór dziewcząt* (*Sztoż my waszeci skażem*...) і *Chór chłopców* (*My ad sachi, ad barany*...) у вершаваным сцэнарыі святкавання імянінаў Юзафа Яжоўскага і Юзафа Кавалеўскага) (Czubek, 1922, s. 78–79).

Выкарыстанне ідыёму і польскай мовы ў адным тэксце выразна адрозніваласа як у стылёвых, так і ў функцыянальных адносінах. Так, у аповесці Ігнацыя Яцкоўскага *Powieść z czasu mojego czyli Przygody litewskie* (1-е выд. – Лондан, 1854, 2-е выд. – Познань, 1858) пры апісанні падзей 1811 г. прыгадваецца набажэнства ва ўніяцкай царкве, пры гэтым фрагменты літургіі на рускай мове чаргуюцца з фразамі святара, звернутымі да народа на польскай мове:

> [...] gdy Kapłan wymawiał owe uroczyste słowa „So strachom Bożym pokłonim sia" [...] obróciwszy się do ludu, przemówił: „Dziatki, nie upadajcie na duchu..."; [...] Potem pod twoją obronę poddajemy się S. Boża Rodzicielko, i zakończył to wszystko prześlicznym Hymnem, w ruskim języku: „Pod Twoju Miłość poddajemy sia Boże, Boże, Boże, nasz" [Jackowski, 1858, s. 86–87].

Як бачым, сам аўтар, пішучы па-польску, адназначна дэфініюе другую мову як рускую (*język ruski*). Аднак гэта была ўмоўная назва, найбольш агульнае пазначэнне асноўнага сродку камунікацыі ў беларускай культурнай прасторы. Усе мовы і дыялекты, якія прымалі ўдзел у моўным кантакце, былі роднаснымі, таму Міцкевіч, Чачот і іншыя адукаваныя людзі адчувалі іх блізкасць. Разам з тым, усе разнастайныя элементы, задзейнічаныя ў моўным кантакце, былі роднаснымі той мове, якая з канца XVIII ст. пачала функцыянаваць як мова імперскага цэнтра, – расійскай. Гэта агульназразумелая акалічнасць спрычынілася да адмысловых праграм моўнага будаўніцтва.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай сфарміравалася новая не толькі палітычная, але і культурная сітуацыя. Для польскай мовы, якая ў Рэчы Паспалітай на працягу доўгага перыяду выконвала ролю надэтнічнай *lingua franca*, узнікла рэальная пагроза з боку расійскай. На пачатку XIX ст. многія дзеячы польскай асветы пісалі пра неабходнасць абараніць польскую мову ва ўмовах культурнай

[4] Больш дэталёвы аналіз спецыфікі мяшанага ідыёму ў беларускай культурнай прасторы XVIII – XIX стст. вымагае асобнага соцыялінгвістычнага даследавання.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

агрэсіі Расійскай імперыі. Адам Казімір Чартарыйскі сфармуляваў у сваёй кнізе *Myśli o pismach polskich* (1810) найважнейшую задачу для кожнага, хто размаўляе і піша па-польску: „[...] zapobiegać zniszczeniu i zepsuciu języka, którym nasi waleczni mawiali przodkowie, zachować ów drogi i jedyny szczątek razem ze krwią po tylu stratach nam tylko pozostały" (Czartoryski, 1810, s. 84).

Мяшаны ідыём у такіх абставінах рабіўся казырнай картай як для расійскіх чыноўнікаў ад культуры, так і для літаратараў з беларускай культурнай прасторы. Для першых ён мог зрабіцца зручным інструментам русіфікацыі, паколькі расійскія інтэлектуалы ў большасці сваёй разглядалі любыя элементы гэтай моўнай стыхіі як разнавіднасць расійскай. Для другіх мяшаны ідыём быў відавочным сродкам ачышчэння польскай мовы і яе захавання. З пачаткам расійскага палітычнага панавання ўзнікла пільная патрэба ў змяненні моўнай свядомасці жыхароў беларускай культурнай прасторы: жыццёва неабходна было паказаць і давесці, што руская мова і розныя ўсходнеславянскія дыялекты блізкія не расійскай, а польскай мове. Пачынальнік польскай лексікаграфіі Самуіл Багуміл Ліндэ, спасылаючыся на старадрукаваныя тэксты XVI і XVII стст. з ВКЛ, шырока выкарыстоўваў матэрыялы рускай мовы ў сваім выданні *Słownik języka polskiego* (1807–1814) (гл.: Lewaszkiewicz, 2016, s. 99). Менавіта ў рускай мове Ліндэ бачыў той патэнцыял, які будзе садзейнічаць ачышчэнню і ўзбагачэнню польскай. Іншыя этнографы і лінгвісты таксама разглядалі беларускую мову як архаічную, чыстую форму польскай (Lewis, 2019a, s. 28–29).

Тая ж матывацыя кіравала Янам Чачотам у яго працы над выданнем беларускіх і ўкраінскіх народных песняў. У прадмове да першага зборніка *Piosnki wieśniacze z nad Niemna* (1837) перакладчык і выдавец змясціў вельмі важную канстатацыю: „Język wieśniaków i nasz piśmienny nie tak wielce różne od siebie" (Czeczot, 1837, s. VII). Паколькі ў першым, другім, трэцім і пятым тамах Чачот змясціў тэксты народных песняў з-над Нёмана, Дзвіны, Дняпра і Дністра толькі ў перакладзе на польскую мову (!), а ў чацвёртым томе падаў тэксты на „славяна-крывіцкай мове" (так называў яе Чачот) паралельна з іх паэтычнымі пераставарэннямі па-польску, зразумела, што *nasz piśmienny język* у працытаваным фрагменце прадмовы Яна Чачота – гэта не руская, а польская мова.

Кіруючыся ідэяй пра блізкасць паміж польскай і „славяна-крывіцкай мовай", Ян Чачот апублікаваў больш за 500 тэкстаў народных беларускіх і ўкраінскіх песняў у перакладзе на польскую мову. У чацвёртым і шостым тамах ён змясціў перакладныя тэксты ў суправаджэнні арыгіналаў або нават толькі ў арыгінале, але з адсылкай да апублікаваных раней тэкстаў у перакладзе на польскую мову, дзе была змешчана таксама прасадычная (метрычная) схема. Веданне прасадычнай схемы дазваляла мяняць мову пры выкананні песні. Праз гэта перакладчык і выдавец спадзяваўся, што беларускамоўныя зямяне і дробныя мяшчане паступова пяройдуць на польскую мову пад дабратворным уплывам іх дбайных паноў – або прынамсі не пяройдуць на расійскую мову. Лацінскі шрыфт

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

выдадзеных Чачотам беларускамоўных тэкстаў павінен быў значна паспрыяць у вырашэнні задачы абароны польскай мовы. Такім чынам, калі нават Чачот, у адпаведнасці з метафарай Уладзіміра Мархеля, хацеў працягнуць беларускаму селяніну руку маральнай падтрымкі (Marhel′, 2007a, s. 189), то ў гэтай руцэ была кніга, якая дапамагала беларускім сялянам авалодаць польскай мовай. Пазней дакладна такая задача была сфармулявана ў форме адкрытай дэкларацыі, але, зразумела, у кнізе, выдадзенай за межамі Расійскай імперыі. Ураджэнец гістарычнай Белай Русі (Віцебшчыны) Аляксандр Рыпінскі змясціў у сваёй кнізе *Białoruś. Kilka słów o poezji prostego ludu téj naszéj polskiej prowincii* (Парыж, 1840) наступнае прысвячэнне: „Pierwszemu z kmiotków Białoruskich, co się naprzód czytać, a zatem mówić i myślić po polsku nauczy" (Rypiński, 1840, s. 2).

Лаяльнасць літаратараў беларускай культурнай прасторы да польскай мовы акрамя гісторыка-культурных чыннікаў тлумачыцца яшчэ і сацыяльным. Усе яны былі прадстаўнікамі шляхецкага саслоўя. Выключна ж негатыўным фактарам грамадскага жыцця пасля падзелаў Рэчы Паспалітай зрабілася расійская палітыка „разбораў шляхты", паколькі шляхтай лічылі сябе нашмат больш жыхроў беларускіх зямель, чым гэта фіксавалі афіцыйныя дакументы. У выніку „разбораў шляхты" гэтыя людзі гвалтоўна пазбаўляліся сваіх сацыяльных прывілеяў, але ніякія пастановы расійскіх уладаў не маглі пазбавіць іх шляхецкай самасвядомасці. Унікальнае сведчанне адносна шляхецкай самасвядомасці даў віленскі генерал-губернатар Ілля Бібікаў, які ў 1850-х гадах так апісваў грамадскую сітуацыю ў „заходніх губернях" Расійскай імперыі:

> Przyjechawszy, zastałem tu wszystkich szlachtą; szlachcic-obywatel jechał w karecie, szlachcic-lokaj – za karetą, szlachcic-woźnica – na koźle, szlachcicem był foryś, szlachcicem – stróż, szlachcicem – kucharz w kuchni, szlachcic podawał buty, i kiedy pan rozgniewany chciał ukarać, to służący mówił: „Nie masz prawa, bom ja równy tobie" (Obecne, 1858, s. 31).

Ігар Запрудскі, які прывёў гэтую цытату ў перакладзе на беларускую мову, вызначыў адпаведную псіхалогію дробнай шляхты як „намінальную польскасць" (Zaprudskì, 2003, s. 75). Аднак гэтая польскасць, пры ўсёй яе намінальнасці, была яшчэ адным месцам памяці для таго, хто называў сябе *Nobilis Polonus*. Польскасць дазваляла захоўваць і сакралізаваць культурную спадчыну Рэчы Паспалітай, найважнейшым складнікам якой была польская мова. Менавіта польскасць легітымізавала моўную палітыку такіх літаратараў, як Ян Чачот, Ян Баршчэўскі і Аляксандр Рыпінскі. Іх задачай было не толькі ўвасобіць у формах вытанчанай паэзіі і мастацкай прозы культурныя здабыткі беларускай культурнай прасторы, але і захаваць наяўную складаную сітуацыю моўнага кантакту, у якой не павінна было быць месца для расійскага шавіністычнага ўплыву.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Заключэнне

Нежаданне шэрагу даследчыкаў беларускай літаратуры выразна ідэнтыфікаваць моўную прыналежнасць старажытнага тэксту звязана з іх інтэнцыянальным беларусацэнтрызмам, ад якога аўтары не могуць або не хочуць адмовіцца нават у сітуацыі прызнання полілінгвальнасці даўняга пісьменства. Грамадская сітуацыя як у савецкай, так і ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь, сакралізацыя ідэі барацьбы за вызваленне ад іншаземнага ўплыву (беларускі варыянт *translatio servilii*) рабілі і робяць неабходнымі такія патрыятычныя наратывы. Пры гэтым стэрэатып *translatio servilii* быў створаны не „варожымі буржуазнымі вучонымі", а самімі беларускімі даследчыкамі. Пасля падзей 2020 і 2022 гг. гэтыя наратывы набылі новую актуальнасць для афіцыйнай прапаганды Рэспублікі Беларусь, якая скіравала ідэю вызвалення ад іншаземнага ўплыву выключна ў антыпольскае рэчышча, разважаючы пра ўціск для беларусаў і беларускай мовы з боку ўладаў як Першай, так і Другой Рэчы Паспалітай. Гэтай ідэяй прасякнуты зняты на нацыянальнай кінастудыі „Беларусьфільм" у 2023 г. мастацкі фільм рэжысёра Андрэя Хрулёва *На другом беразе*. У той жа час полікультурная і шматмоўная выява беларускай культурнай прасторы XVI–XIX стст. штучна падмяняецца (як у савецкія часы) уяўленнем пра культурную агрэсію і прыгнёт.

Літаратуразнаўчая гісторыя вершаў *Полска квитне[т] лациною..., Wsem mnohi wiek w nowoy chaty..., Użo ptaszki piajuć usiudy...*, а таксама іншыя прыклады суб'ектыўных інтэрпрэтацый, адвольных аўтарскіх ідэнтыфікацый і ненавуковага абыходжання з беларускамоўнымі тэкстамі XVI–XIX стст. сведчаць пра неабходнасць далейшай рэвізіі канцэптуальных падыходаў да вывучэння помнікаў гісторыі беларускай літаратуры, а таксама тэксталагічных прынцыпаў іх выдання. Складанасць выявы моўнага кантакту ў беларускай культурнай прасторы вызначанага перыяду выключае магчымасць неадэкватнага, зменена ў моўных адносінах увасаблення старажытнага тэксту ў межах навуковага даследавання. Шырокая распаўсюджанасць дэзідэратных перакладаў на беларускую мову ў навуковым і адукацыйным дыскурсе фармуе сфальсіфікаваную нацыянальную ідэнтычнасць. У сітуацыі даступнасці дыгіталізаваных версій амаль усіх найважнейшых літаратурных тэкстаў варта прызнаць абсалютна недапушчальнымі ў межах беларусістычнага даследавання цытаванне іншамоўнага помніка пісьменства ў перакладзе на беларускую мову, а таксама замену графікі з лацінкі на кірыліцу. Адмысловай увагі даследчыка літаратуры заслугоўвае таксама функцыянальны аспект прысутнасці беларускай мовы ў тэксце, яе стылістычная якасць, спосаб прэзентацыі.

Руская мова ВКЛ, якую беларускія і замежныя даследчыкі часта называюць старабеларускай або нават проста беларускай, набыла сімвалічнае значэнне толькі ў перыяд нацыянальнага адраджэння (канец XIX – пачатак XX ст.)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

і не сакралізавалася аўтарамі XVI–XVIII стст. На працягу ўсяго гістарычнага перыяду яе актыўнага функцыянавання руская мова абслугоўвала абмежаваную колькасць жанраў пісьменства. Пры гэтым ва ўмовах шчыльнага моўнага кантакту, у сітуацыі адсутнасці кадыфікацыі яна паступова пераўтваралася ў мяшаны ідыём, які функцыянаваў у самых розных моўна-дыялектных камбінацыях у вусным маўленні беларускай культурнай прасторы. Аж да XVIII ст. мяшаны ідыём выкарыстоўваўся ў прынагодных вершах і песенных тэкстах, у гумарыстычных і сатырычных (пераважна рукапісных) наратывах. Час ад часу ён фіксаваўся таксама ў мастацкіх тэкстах XIX ст.

Ян Чачот выкарыстоўваў мяшаны ідыём для паэтычных стылізацый філамацкага перыяду (*Wiersz białoruski na przyjazd Adama; Jeżowe. Na imieniny Józefa Jeżowskiego i Józefa Kowalewskiego, filomatów,* 1819). Побач з тэкстамі на мяшаным ідыёме з канца XVIII – пачатку XIX ст. ствараліся тэксты на новай беларускай мове ў адным з яе дыялектных варыянтаў: беларускамоўныя вершы Яна Баршчэўскага, беларуская травестыйная *Энеіда*, верш Яна Чачота *Da miłych mużyczkōú*, балада Аляксандра Рыпінскага *Niaczyścik*, паэма Адэлі з Устроні (Габрыэлі Пузынінай – ?) *Matczycha*.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай руская мова ВКЛ канчаткова выйшла з пісьмовага ўжытку, але набыла адмысловае сімвалічнае значэнне і адыгрывала ролю істотнага складніка культурнай памяці ўсіх інтэлектуалаў, якія паходзілі з рускіх зямель ВКЛ. Яна атаясамлівалася з жывым маўленнем беларускага або ўкраінскага народа і пазіцыянавалася як грунт нефармальнай філалагічнай праграмы, накіраванай на абарону польскай мовы перад пагрозай русіфікацыі. Апублікаванне фальклорных тэкстаў і першыя спробы арыгінальнага вершавання на беларускай мове ў першай палове XIX ст. мелі на мэце захаванне культурных і сацыяльных сувязяў паміж простым людам і шляхтай ва ўмовах агрэсіўнай палітыкі Расійскай імперыі.

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Auer, Peter. (1999). From codeswitching via language mixing to fused lects: Toward a dynamic typology of bilingual speech. *International Journal of Bilingualism*, 3, p. 309–332.

Bagdanovìč, Ìryna. (2020.) Jan Kazimir Pashkevich's Poem Poland prospers with Latin... as a Literary Mystification. *Studia Białorutenistyczne*, 14, s. 171–202.

Barščèŭskaâ, Nìna. (2013). Ètapy razvìccâ starabelaruskaj movy ŭ kantakce z movamì susednìh narodaŭ. *Acta Albaruthenica,* 13, s. 123–134. [Баршчэўская, Ніна. (2013). Этапы развіцця старабеларускай мовы ў кантакце з мовамі суседніх народаў. *Acta Albaruthenica,* 13, с. 123–134].

Bieder, Hermann. (2017). *Kommentar zur Sprachpolitik und Sprachsituation in Weißrussland (1795–1939)*. In: *Anton Luckevič. Belaruskaja hramatyka*, č. 1: *Fanetyka i ètymalohija. Vìl'nja 1916 hod*, Edition und Kommentar von H. Bieder, B. 2 (s. 205–410), Oldenburg: BIS-Verlag.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Bobrownicka, Maria. (2003). *Pogranicza w centrum Europy. Slavica*. Kraków: Universitas.

Budz'ko, Ìryna. (2017). Moŭnaâ sìtuacyâ ŭ Vâlìkìm Knâstve Lìtoŭskìm ì farmìravanne nacyânal'naj svâdomascì belarusaŭ. W: *Mova âk faktar zahavannâ nacyânal'naj ìdèntyčnascì: belaruska-ŭkraìnskì kantèkst* (s. 63–68). Minsk: Kovčeg. [Будзько, Ірына. (2017). Моўная сітуацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім і фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. У: *Мова як фактар захавання нацыянальнай ідэнтычнасці: беларуска-ўкраінскі кантэкст* (с. 63–68). Мінск: Ковчег].

Bogdan, Alena; Čamâryckì, Vâčaslaŭ, (red.). (2003). *Antalogìâ daŭnâj belaruskaj lìtaratury: XI – peršaâ palova XVIII stagoddzâ*. Minsk: Belaruskaja navuka. [Богдан, Алена; Чамярыцкі, Вячаслаў, (рэд.). (2003). *Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя*. Мінск: Беларуская навука].

Bryl′, Anton Francìšak. (2019). Aŭtarstva verša „Užo ptuškì pâûc′ usûdy...": Čèslaŭ Ânkoŭskì. *Rodnae slova*, 1, s. 7. [Брыль, Антон Францішак. (2019). Аўтарства верша „Ужо птушкі пяюць усюды...": Чэслаў Янкоўскі. *Роднае слова*, 1, с. 7].

Bulyka, Alâksandr, (i in.). (1988). *Mova belaruskaj pìs'mennascì XIV–XVIII stst*. Minsk: Navuka ì tèhnìka. [Булыка, Аляксандр, (і інш.). (рэд.). (1988). *Мова беларускай пісьменнасці XIV – XVIII стст.* Мінск: Навука і тэхніка].

Bunčić, Daniel. (2006). *Die ruthenische Schriftsprache bei Ivan Uževyč: unter besonderer Berücksichtigung der Lexik seines Gesprächsbuchs Rozmova/Besěda: mit Wörterverzeichnis und Indizes zu seinem ruthenischen und kirchenslavischen Gesamtwerk*. München: Verlag Otto Sagner.

Buraczok, Maciej, [Bahuszewicz, Franciszak]. (1891). *Dudka biełaruskaja Macieja Buraczka. Wudanie druhoje*. Krakou: Drukawau swaim kosztam wł. L. Anczyc i S-ka.

[Comalada, Miguel]. (1625). *Desiderosus Abo Ścieszka do Miłości Bożej y do Doskonałości żywota Chrześciańskiego [...] z hiszpańskiego [...] na Polski przełożony [...], przez Gaspara Wilgowskiego, teraz znowu do druku podany przez Oyca Kassiana Sakowicza*. Kraków: w drukarni Andrzeja Piotrkowczyka.

Cvìrka, Kastus′, (red.). (2000). *Lìtaratura Belarusì. Peršaâ palova XIX stagoddzâ. Hrèstamatyâ*, Minsk: Belaruskaja navuka. [Цвірка, Кастусь, (рэд.). (2000). *Літаратура Беларусі. Першая палова XIX стагоддзя. Хрэстаматыя*. Мінск: Беларуская навука].

Czartoryski, Adam Kazimierz. (1801 [w istocie 1810]). *Myśli o pismach polskich z uwagami o sposobach pisania w rozmaitych materyach*. Wilno: Nakładem i drukiem Józefa Zawadzkiego. Pobrano z: https://polona.pl/item/mysli-o-pismach-polskich-z-uwagami-nad-sposobem-pisania-w-rozmaitych-materyach,NjYxMTkwMzM/8/#info:metadata (dostęp: 5.01.2024).

[Czeczot, Jan]. (1837). *Piosnki wieśniacze z nad Niemna. We dwóch częściach*. Wilno: drukiem Józefa Zawadzkiego. Pobrano z: https://rcin.org.pl/dlibra/publication/109370/edition/86335/content (dostęp: 5.01.2024).

[Czeczot, Jan]. (1846). *Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy, w mowie Sławiano-Krewickiej, s postrzeżeniami nad nią oczynionemi*. Wilno: Drukiem Józefa Zawadzkiego. Pobrano z: https://polona.pl/item-view/a24452db-87cf-458a-9f67-30919c47963e?page=108 (dostęp: 5.01.2024).

Czubek, Jan (red.). (1922). *Poezja Filomatów*. T. II. Kraków: Nakładem Polskiej Akademii Umiejętności.

Čemerickij, Vâčeslav. (1985). Belorusskaâ literatura. W: Georgij Berdnikov (red.). *Istoriâ vsemirnoj literatury*, t. 3 (s. 493–501), Moskva: Nauka. [Чемерицкий, Вячеслав. (1985). Белорусская литература. В: Георгий Бердников (ред.). *История всемирной литературы*, т. 3 (с. 493 – 501). Москва: Наука].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Filûškin, Aleksandr. (2008). Drugaâ Rus′ v russkoj istoriografii. [Филюшкин, Александр. (2008). Другая Русь в русской историографии]. W: Alfredas Bumblauskas i in. (red.), *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštijos tradicija ir paveldo „dalybos"* (s. 94–115). Vilnius: Vilniaus universiteto leidykla.

Garèckì, Maksìm. (1921). *Gìstoryâ belaruskae lìtaratury. Vydan′ne drugoe, papraŭlenae*. Vìl′nâ: Vìlenskae vydavectva. [Гарэцкі, Максім. (1921). *Гісторыя беларускае літаратуры. Выданьне другое, папраўленае*. Вільня: Віленскае выдавецтва].

Hentschel, Gerd. (2017). Odinnadcat′ voprosov i otvetov po povodu belorusskoj trasânki. *Russkij âzyk v naučnom osveŝenii*, 1/33, s. 209–250. [Хеншель, Герд. (2017). Одиннадцать вопросов и ответов по поводу белорусской «трасянки». *Русский язык в научном освещении*, 1/33, с. 209–250].

[Jackowski, Ignacy]. (1858). *Powieść z czasu mojego, czyli Przygody Litewskie*. Poznań: w Komisie Księgarni Jana Konstantego Żuprańskiego. Pobrano z: https://polona.pl/item-view/ea5aca1d-8daf-4953-94e0-ba84c678848c?page=8 (dostęp: 8.01.2024).

Karotkì, Uladzìmìr. (2013). *Belaruskaâ lìtaratura ì gìstoryâ*. Minsk: BDU [Кароткі, Уладзімір. (2013). *Беларуская літаратура і гісторыя*. Мінск: БДУ].

Karotkì, Uladzìmìr. (1991). Belaruskìâ pradmovy ì paslâsloŭì drugoj palavìny XVII st. W: Idem (red.). *Pradmovy ì paslâsloŭì paslâdoŭnìkaŭ Francyska Skaryny* (s. 6–22). Mìnsk: Navuka ì tèhnìka. [Кароткі, Уладзімір. (1991). Беларускія прадмовы і пасляслоўі другой палавіны XVII ст. У: Idem (рэд.). *Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны* (с. 6–22). Мінск: Навука і тэхніка].

Kavalenka, Viktar. (1977). *Vytokì, uplyvy, paskoranasc′: razvìccë belaruskaj lìtaratury XIX–XX stahoddzjaŭ*. Minsk: Navuka ì tèhnìka. [Каваленка, Віктар. (1977). *Вытокі, уплывы, паскоранасць: развіццё беларускай літаратуры XIX–XX стагоддзяў*. Мінск: Навука і тэхніка].

Kavalëŭ, Sârgej. (2011). *Lìtaratura Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga XI – pačatku XVII st.: fenomen kul′turnaga pamežža*. Minsk: Knìgazbor. [Кавалёў, Сяргей. (2011). *Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XI – пачатку XVII ст.: феномен культурнага памежжа*. Мінск: Кнігазбор].

Kavalëŭ, Sârgej. (2010). *Šmatmoŭnaâ paèzìâ Vâlìkaga Knâstva Lìtoŭskaga èpohì Rènesansu*. Mìnsk: Knìgazbor. [Кавалёў, Сяргей. (2010). Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу. Мінск: Кнігазбор].

Kurzowa, Zofja. (1993). *O mowie polaków na Kresach Wschodnich*. Kraków: Wyd-wo i drukarnia „Secesja".

Lewaszkiewicz, Tadeusz. (2016). Zainteresowania białorutenistyczne Samuela Bogumila Lindego. W: Maria Biolik i in. (red.). *Slavica, onomastica, regionalia. Prace dedykowane Panu Profesorowi Jerzemu Dumie* (s. 97–105). Olsztyn: Wydawnictwo Uniwersytetu Warmińsko-Mazurskiego.

Lewis, Simon. (2019a). *Belarus – Alternative Visions: Nation, Memory and Cosmopolitanism*, New York/London: Routledge.

Lewis, Simon. (2019b). Cosmopolitanism as Subculture in the Former Polish-Lithuanian Commonwealth. W: Jan Fellerer i in. (red.). *Identities In-Between in East-Central Europe* (s. 149–169). London: Routledge.

Lubomirski, xiążę Tadeusz. (1860). *Wstęp*. W: T[adeusz] L[ubomirski] X[ią]że (red.). *Pamiętnik Teodora Jewłaszewskiego, nowogrodzkiego podsędka. 1546–1604* (s. VII–XI). Warszawa: w Księgarni R. Friedlejna.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Maldzis, Adam. (2001). *Âk žylì našy prodkì ŭ XVIII stagoddzì*. Minsk: Lìmaryus. [Мальдзіс, Адам. (2001). *Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі*. Мінск: Лімарыус].

Maldzis, Adam. (2010). Lìtaratura poznâga Baroka. W: Vâčaslaŭ Čamâryckì i in. (red.). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XI–XIX stagoddzâŭ*, t. 1: *Daŭnââ lìtaratura XI – peršaâ palova XVIII stagoddzâ*. 3-e vyd. (s. 824–855). Minsk: Belaruskaâ navuka. [Мальдзіс, Адам. (2010). Літаратура позняга Барока. У: Вячаслаў Чамярыцкі і інш. (рэд.). *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў*, т. 1: *Даўняя літаратура XI – першая палова XVIII стагоддзя*. 3-е выд. (с. 824–855). Мінск: Беларуская навука].

Maldzis, Adam. (1978). Nieznany wiersz białoruski ze zbiorów Kórnickich. *Pamiętnik Biblioteki Kórnickiej*, 14, s. 177–180.

Maldzis, Adam; Marhel′, Uladzìmìr. (2007). Pačatak stanaŭlennâ novaj lìtaratury. W: Uladzìmìr Marhel′, Vâčaslaŭ Čamâryckì (red.). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XI–XIX stagoddzâŭ*, t. 2: *Novaâ lìtaratura. Drugaâ palova XVIII–XIX stagoddze* (s. 8–25). Minsk: Belaruskaâ navuka. [Мальдзіс, Адам; Мархель, Уладзімір. (2007). Пачатак станаўлення новай літаратуры. У: Уладзімір Мархель, Вячаслаў Чамярыцкі (рэд.). *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў*, т. 2: *Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX стагоддзе* (с. 8–25). Мінск: Беларуская навука].

Marhel′, Uladzìmìr. (2007a). Ян Чачот. W: Uladzìmìr Marhel′, Vâčaslaŭ Čamâryckì (red.). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XI–XIX stagoddzâŭ*, t. 2: *Novaâ lìtaratura. Drugaâ palova XVIII–XIX stagoddze* (s. 177–198), Minsk: Belaruskaâ navuka. [Мархель, Уладзімір. (2007a). Уладзіслаў Сыракомля. У: Уладзімір Мархель, Вячаслаў Чамярыцкі (рэд.). *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў*, т. 2: *Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX стагоддзе* (с. 177–198), Мінск: Беларуская навука].

Marhel′, Uladzìmìr. (2007b). Uladzìslaŭ Syrakomlâ. W: Uladzìmìr Marhel′, Vâčaslaŭ Čamâryckì (red.). *Gìstoryâ belaruskaj lìtaratury XI–XIX stagoddzâŭ*, t. 2: *Novaâ lìtaratura. Drugaâ palova XVIII–XIX stagoddze* (s. 251–274), Minsk: Belaruskaâ navuka. [Мархель, Уладзімір. (2007b). Уладзіслаў Сыракомля. У: Уладзімір Мархель, Вячаслаў Чамярыцкі (рэд.). *Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў*, т. 2: *Новая літаратура. Другая палова XVIII–XIX стагоддзе* (с. 251–274), Мінск: Беларуская навука].

McMillin, Arnold. (1977). *Die Literatur der Weißrussen: a history of Byelorussian literature from its origins to the present day*. Giessen: Schmitz.

McMillin, Arnold. (2023). The Fate of the Belarusian Literary Language over Half a Century. *Acta Albaruthenica*, 23, p. 63–72.

Mečkovskaâ, Nina. (1984). *Rannie vostočnoslavânskie grammatiki*. Minsk: Universitetskoe. [Мечковская, Нина. (1984). *Ранние восточнославянские грамматики*. Минск: Университетское].

Mickiewicz, Adam. (1860). Pisma Adama Mickiewicza wydanie zupełne, tom XVIII, *Cours de la littérature slave, professé à Collège de France*, vol. 2: *Histoire politique et littéraire (1841–1842)*, Paryż: Drukarnia L. Martinet.

Moser, Michael. (2002). Čto takoe „prostaja mova". *Studia Slavica Hung,* 47/3–4, p. 221–260.

Moser, Michael. (2005). Mittelruthenisch (Mittelweißrussisch und Mittelukrainisch): Ein Überblick. *Studia Slavica Hung*, 50/1–2, p. 125–142.

Nekrašèvìč-Karotkaâ, Žanna. (2017). Identitätsfigurationen polnischsprachiger Schriftsteller aus Belarus-Litauen in belarussischen literaturhistorischen Diskursen. W: Heinrich Kirschbaum (hrsg.), *Wiedergänger, Pilger, Indianer. Polen-Metonymien im langen 19. Jahrhundert* (s. 279–303). Frankfurt a.M. u.a.: Peter Lang.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Nekrašèvìč-Karotkaâ, Žanna. (2020a). *Belarus' âk kul'turnaâ prastora ì eŭrapejskì lìtaraturny pracès XVI–XIX stst.: dapamožnìk*. Mìnsk: BDU. [Некрашэвіч-Кароткая, Жанна. (2020a). *Беларусь як культурная прастора і еўрапейскі літаратурны працэс XVI–XIX стст.: дапаможнік*. Мінск: БДУ].

Nekrašèvìč-Karotkaâ, Žanna. (2020b). Belaruskasc′ âk modus farmìravannâ patryâtyčnaj svâdomascì ŭ ajčynnym gìstoryka-lìtaraturnym dyskurse. W: Ìryna Bagdanovìč (red.), *Aktual'nyâ aspekty belarusìstykì: matèryâly VI mìžnarodnaga kangrèsa belarusìstaŭ (2015): zb. art*. (s. 39–50). Minsk: Knìgazbor. [Некрашэвіч-Кароткая, Жанна. (2020a). Беларускасць як модус фарміравання патрыятычнай свядомасці ў айчынным гісторыка-літаратурным дыскурсе. У: Ірына Багдановіч і інш. (рэд.), *Актуальныя аспекты беларусістыкі: матэрыялы VI міжнароднага кангрэса беларусістаў (2015): зб. арт.* (с. 39–50). Мінск: Кнігазбор.

Niendorf, Mathias. (2006). *Das Großfürstentum Litauen. Studien zur Nationsbildung in der Frühen Neuzeit (1569–1795)*. Wiesbaden: Harrasowitz Verlag, 3 Ktn. = *Veröffentlichungen des Nordost-Instituts*, 3.

Nora, Pierre. (1999). Problematika mest pamâti. W: Pierre Nora, Mona Ozouf, de Puymège, Michel Winock Gérard (red.). *Francià – pamât'*, per. s fr.: Dina Hapaeva (s. 17–50). Sankt-Petersburg: Izdatel′stvo Sankt-Peterburgskogo universiteta. [Нора, Пьер. (1999). Проблематика мест памяти. У: Пьер Нора; Мона Озуф, де Пюимеж; Мишель Винок Жерар, (ред.). *Франция – память*, пер. с фр.: Дина Хапаева (с. 17–50). Санкт-Петербург: Издательство Санкт-Петербургского университета].

Obecne polityczne usposobienie. (1858). Obecne polityczne usposobienie Rusi. *Przegląd Rzeczy Polskich*, 1, 3 stycznia, s. 27–38.

Pielgrzymowski, Eliasz. (2010). *Poselstwo i krótkie spisanie rozprawy z Moskwą*, oprac. Roman Krzywy, red. Dariusz Chemperek, Jan Gruchała. Warszawa: Neriton.

Rohdewald, Stefan. (2007). Rezension zu: *Niendorf, Mathias: Das Großfürstentum Litauen. Studien zur Nationsbildung in der Frühen Neuzeit (1569–1795). Wiesbaden 2006*. W: H-Soz-Kult, 07.12.2007. Pobrano z: <www.hsozkult.de/publicationreview/id/reb-9721> (dostęp: 8.01.2024).

Rutz, Marion. (2021). One People, One Language, One Literatur? Changing Constructions of the Historz of Old Belarusian Literature (1956–2010). *Studia Białorutenistyczne*, 14, s. 119–156.

Rutz, Marion. (2022). Lithuanians and Poles, and the Language(s) of Polemics. Multilingual Capital in Stanisław Orzechowski's Quincunx (1564) and Augustinus Rotundus's Rozmowa Polaka z Litwinem (1565/66). W: Monika Bednarczuk, Marion Rutz (red.), *Das historische Litauen als Perspektive für die Slavistik: Verflochtene Narrative und Identitäten* (s. 59–107). Wiesbaden: Harrassowitz.

Rypiński, Alexander. (1840). *Białoruś. Kilka słów o poezji prostego ludu téj naszéj polskiej prowincii; o jego muzyce, śpiewie, tańcach, etc*. Paryż.

Slìž, Natallâ. (2013). Sfery vykarystannâ starabelaruskaj movy âk pakazčyk âe stanu razvìccâ ŭ XVI stagoddzì. *Acta Albaruthenica,* 13, s. 187–198. [Сліж, Наталля. (2013). Сферы выкарыстання старабеларускай мовы як паказчык яе стану развіцця ў XVI стагоддзі. *Acta Albaruthenica,* 13, с. 187–198].

Šlûbskì, Alâksandr. (1928). Adnosìny rasìjskaga ŭradu da belaruskae movy ŭ XIX st. *Zapìskì addzelu gumanìtarnyh navuk*, kn. 2: *Pracy klâsy filëlëgìì*, t. 1 (s. 303–337). Minsk. [Шлюбскі, Аляксандр. (1928). Адносіны расійскага ўраду да беларускае мовы ў XIX

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

ст. *Запіскі аддзелу гуманітарных навук*, кн. 2, *Працы клясы філёлёгіі*, т. 1 (с. 303–337). Мінск].

Trypućko, Józef. (1955). *Język Władysława Syrokomli (Ludwika Kondratowicza). Przyczynek do dziejów polskiego języka literackiego w wieku XIX*, Uppsala: A.-B. Lundequistska Bokhandeln; Wiesbaden: Otto Harrassowitz.

Tyszkiewicz, Eustachy. (1871). *Nasze strony. Obrazek litewski*. W Krakowie: Nakładem Wydawnictwa Dzieł Władysława Jaworskiego. Pobrano z: http://bc.wbp.lublin.pl/dlibra/docmetadata?id=2898&from=publication (dostęp: 5.01.2024).

Twaranowicz, Halina; Sakowicz, Alena, (red.). (2004). *Starabelaruskaâ lìtaratura XI–XVIII stst. Hrèstamatyâ,* Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku. [Тварановіч, Галіна; Саковіч, Алена, (рэд.). (2004). *Старабеларуская літаратура XI–XVIII стст. Хрэстаматыя*. Беласток: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku].

Vinogradov, Viktor. (1990). Idiom. W: Viktoriâ Ârceva i dr. (red.). *Lingvističeskij ènciklopedičeskij slovar'* (s. 171). Moskva: Sovetskaâ ènciklopediâ. [Виноградов, Виктор. (1990). Идиом. В: Ярцева, Виктория и др. (ред.). *Лингвистический энциклопедический словарь* (с. 171). Москва: Советская энциклопедия].

Wasiluk, Joanna. (2012). Da prablemy stanaŭlennâ nacyânal'naj ìdèì ŭ belaruskaj lìtaratury XIX stagoddzâ. [Да праблемы станаўлення нацыянальнай ідэі ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя]. *Acta Polono-Ruthenica,* 17, s. 51–67.

Zaprudskì, Ìgar. (2003). *Narysy gìstoryì belaruskaj lìtartury XIX stagoddzâ*. Minsk: RÌVŠ BDU. [Запрудскі, Ігар. (2003). *Нарысы гісторыі беларускай літартуры XIX стагоддзя*. Мінск: РІВШ БДУ].

Żera, Karol, 1980. *Vorago rerum. Torba śmiechu. Groch z kapustą. A każdy pies z innej wsi...*, wstęp, komentarz i opracowanie Kazimiera Żukowska, Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.

Żukowska, Kazimiera. (1980). Żera, czyli u źródeł autentyku gawędy szlacheckiej. W: Karol Żera, *Vorago rerum. Torba śmiechu. Groch z kapustą. A każdy pies z innej wsi...* Wstęp, komentarz i opracowanie Kazimiera Żukowska (s. 5–22). Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.

Žuraŭskì, Arkadz′. (1990). Starabelaruskaâ lìtaraturna-pìs′movaâ mova. W: Ìvan Šamâkìn ì ìnš. (red.). *Francysk Skaryna ì âgo čas: ènciklapedyčny davednìk* (s. 507–508). Mìnsk: Belaruskaâ Saveckaâ Ènciklapedyâ. [Жураўскі, Аркадзь. (1990). Старабеларуская літаратурна-пісьмовая мова. У: Іван Шамякін і інш. (рэд.). *Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік* (с. 507–508). Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя].

SUBMITTED: 2024.03.22
ACCEPTED: 2024.10.28
PUBLISHED ONLINE: 2025.01.08

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Zhanna Nekrashevich-Karotkaja – Polska, Poznań, Uniwersytet im. Adama Mickiewicza, Zakład Białorutenistyki; dr hab.; prof. UAM; s*pecjalność*: literaturoznawstwo; z*ainteresowania naukowe*: historia literatur słowiańskich, hermeneutyka literacka.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 12/11/2026 19:13:33

Adres: Wydział Neofilologii UAM, Instytut Filologii Wschodniosłowiańskich, Al. Niepodległości 4, Poznań, 61-874, Polska

Wybrane publikacje:

1. Niekraszewicz-Karotkaja, Żanna. (2024). „Przypatrzcie się ptakom podniebnym": „ptasia kuchnia" opracowania piosenek ludowych w kulturze poetyckiej XVIII wieku. W: Danuta Kowalewska i in. (red.). *Wiek osiemnasty od kuchni. IV Kongres Badaczy Osiemnastego Wieku* (s. 587–605). Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Mikołaja Kopernika w Toruniu.
2. Nekraševič-Karotkaja, Žanna. (2022). Der Brauch der Vogelhochzeit und Lieder mit Vogelmotiven in der Folklore der nordwest- und ostslawischen Völker: Pragmatische und funktionale Aspekte. *Lětopis*, 69/1, s. 3–20.
3. Niekraszewicz-Karotkaja, Żanna. (2022). Псалтирь царя Давида Симеона Полоцкого в контексте паралитургической и парафрастической традиции XVI–XVII вв. *Studia Rossica Posnaniensia*, XLVII/2, s. 9–25.
4. Nekrashevich-Karotkaja, Zhanna. (2022). Канфігурацыі ідэнтычнасці і герменеўтычныя перспектывы „Carmen de bisonte": да 500-годдзя апублікавання паэмы Мікалая Гусоўскага. *Białorutenistyka Białostocka*, 14, s. 37–65.
5. Некрашэвіч-Каротkая, Жанна. (2020). *Беларусь як культурная прастора і еўрапейскі літаратурны працэс XVI–XIX стст.* Мінск: БДУ.